занятия по психологии. На этих занятиях подростки обучаются эмпатии, альтруизму и нравственным отношениям. Подобные же занятия в форме спецкурсов пользуются популярностью среди студенческой молодежи (работа проводилась в психологических и педагогических частных вузах России; причем к ней часто присоединялись студенты других специальностей). *Последнее свидетельствует о том, что, вопреки массовой духовной деградации молодежи, та же молодежь в душе стремится к гуманизму. И здесь дело за преподавателями – нужно, по-видимому, не сетовать на «испорченность» молодежи, а находить формы эффективной воспитательной работы.*

При индивидуальной психологической помощи наш опыт показывает результативность нравственно-ориентированной работы с каждым человеком. Эта работа должна быть не поучающе-морализирующей, а направленной на принятие нравственных ценностей, гуманное отношение к людям и практические нравственные поступки. (Для молодежи это особенно важно!) При всем многообразии личных причин обращения за психологической помощью нет таких случаев, где работа психолога не должна носить нравственно-ориентированного характера. Подлинная гуманность, человечность - основа для разрешения любых жизненных проблем. И происходит это в силу того, что именно человечность для человека является высшей и абсолютной сущностной ценностью.

Литература:

1. Дарвин, Ч. Соч. / Ч. Дарвин. – Т. 5. – М.: изд-во АПН СССР, 1953.
2. Кропоткин, П.А. Этика / П.А. Кропоткин. – М.: Политиздат, 1991.
3. Эфроимсон, В.П. Родословная альтруизма. Этика с позиций эволюционной генетики / В.П. Эфроимсон // Новый мир. –1971. – № 10.
4. Rogers, C.R. Empatic: an unappreciated way of being / C.R. Rogers // The Counseling Psychologist. – 1975. – V. 5. – N 2.
5. Maslow, A. Self-actualizing and Beyond / A. Maslow // Challenges of Humanistic Psychology. – N. Y., 1967.
6. Франкл, В. Человек в поисках смысла / В. Франкл. – М.: Прогресс. – 1990.
7. Фромм, Э. Иметь или быть / Э. Фромм. – М.: Прогресс. – 1991.

## КАШТОЎНАСЦЬ ЯК ВЫЗНАЧАЛЬНЫ АБ’ЕКТ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ

У. А. Жылко, г. Мінск, Беларусь

На сённяшні дзень праблемы духоўнай культуры набываюць незвычайную актуальнасць, што непасрэдным чынам звязана з

асаблівасцямі сучаснай культурнай сітуацыі, для якой у пэўнай ступені характэрны своеасаблівы адыход ад духоўнасці, што прадугледжвае пасіўную энтрапію духоўных патэнцый.

Пад духоўнай культурай варта разумець сукупнасць феноменаў культуры, выражаных у ідэальнай форме. Да такіх аб'ектаў можна аднесці каштоўнасці, ідэі, ідэалы, сімвалы, веды, значэнні, правілы, узоры, эталоны, нормы, законы, міфы, звычаі, традыцыі. Духоўная культура ахоплівае сферу свядомасці, выступае так званым прадуктам духоўнай вытворчасці – стварэння, размеркавання і спажывання духоўных каштоўнасцей. Тым не менш, строгае адасабленне матэрыяльнай і духоўнай культуры з'яўляецца памылковым, паколькі любая ідэя пасля свайго фармулявання аб'ектывуецца ў нейкі артэфакт, твор. Феномен духоўнасці складана выразіць пры дапамозе рацыянальных паняццяў. М. Бердзяеў пісаў, што ў дачыненні да духу нельга выпрацаваць паняцце, але можна выявіць прыкметы: свабоду, сэнс, творчую актыўнасць, цэласнасць, любоў, зварот да боскага свету і яднання [1, с. 172 – 176].

Каштоўнасці, якія выступаюць у якасці аб'екта культуры, аднолькава характэрнага для матэрыяльнай і духоўнай яе разнавіднасці, тым не менш маюць адрозненні ў сваім выражэнні: каштоўнасці ў межах духоўнай культуры ёсць каштоўнасці агульначалавечага плана, яны не маюць межаў спажывання, не маюць коштавага выражэння, практычнай накіраванасці. Як кажуць, натхненне не прадаецца, але рукапіс прадаць можна.

Паводле М. Бярдзяева, чалавек – ёсць істота, якая ацэньвае. Чалавек здольны не проста ажыццяўляць нейкую дзейнасць, але і пэўным чынам ставіцца да гэтага. Каштоўнасці ёсць уяўленні, у якіх адлюстроўваецца значэнне (станоўчае або адмоўнае) для чалавека прадметаў, з'яў, падзей з пункту гледжання задавальнення яго патрэб і інтарэсаў. Дзякуючы сваёй здольнасці каштоўнаснага стаўлення да свету, чалавек напаўняе сваю дзейнасць і жыццё навокал сэнсам – асэнсоўвае яго, вылучае істотнае. Ён такім чынам імкнецца дайсці да каранёў існага – у гэтым і заключаецца сфера духоўнасці. А стваральная, творчая дзейнасць і атрыманы досвед – сферы, у якіх праяўляецца, развіваецца і існуе духоўная культура.

З трох вызначальных кампанентаў духоўнай культуры грамадства (іерархія каштоўнасцей, карціна свету, стыль мыслення) вядучым выступае іерархія каштоўнасцей. Каштоўнасці – дэтэрмінанты сэнсаўтварэння, якое становіцца сэнсавым напаўненнем любой культуры. Каштоўнасці, як з'ява, уласцівая суб'ектам культуры як то асобнаму чалавеку, так і грамадству, неразрыўна звязаны з катэгорыяй культуры. Роля культуры ў жыцці чалавека як цэласнай сукупнасці прадметных і духоўных умоў, перадумоў, што ўздзейнічаюць на яго, яго лад жыцця і светапогляд, немагчыма пераацаніць. Культура ўздзейнічае на чалавека, яго досвед, лад жыцця, тым самым праяўляючы свой сэнсаўтваральны патэнцыял. А каштоўнасці

самі па сабе з’яўляюцца тым стрыжнем, вакол якога будуецца культура, яны вызначаюць стракатасць, шматстайнасць традыцый, нормаў, сімвалаў і праяваў. Інакш кажучы, каштоўнасці адносяцца не да сферы быцця, а да вобласці значэнняў. Можна сказаць, што каштоўнасці адлюстроўваюць асаблівасці, патрэбы, інтарэсы чалавека і служаць падставай ацэнкі значэнні з'яў рэчаіснасці для суб'екта. Такім чынам, стаўленне да суб'екта ёсць зыходны прынцып каштоўнасных адносін. Прадукт матэрыяльнай або духоўнай дзейнасці становіцца дабром, ці каштоўнасцю, менавіта ў рамках гэтых адносін, калі ён нешта значыць для суб'екта. Але калі прызнаць, што чалавек стварае і ў матэрыяльнай і ў духоўнай сферы тое, што мае для яго значэнне, а значнае для суб'екта ёсць каштоўнасць, то выснова адназначная: ўсё створанае чалавекам, гэта значыць яго культура, ёсць каштоўнасць.

Тэма ўзаемадачыненняў культуры і каштоўнасцяў была прадметам разважанняў многіх вядомых філосафаў, паколькі яна тычыцца разумення самой сутнасці культуры. Адзін з заснавальнікаў тэорыі каштоўнасцяў у філасофіі Г. Рыккерт пісаў: "Калі працэс рэалізацыі усеагульных сацыяльных каштоўнасцяў на працягу гістарычнага развіцця мы назавем культурай, то тады мы зможам сказаць, што галоўным прадметам гісторыі з'яўляецца адлюстраванне частак і цэлага культурнага жыцця чалавека…[2, с. 164] ". Для сацыёлага П. Сарокіна каштоўнасці з'яўляюцца асновай, падмуркам усялякай культуры. З гэтымі азначэннямі можна згаджацца і не пагаджацца, але з тым, што такія буйныя мысляры збліжаюць і нават ідэнтыфікуюць культуру і каштоўнасці, безумоўна, варта лічыцца.

П. Сарокін вылучыў каштоўнасць у якасці базавага паняцця, ён падкрэсліваў, што менавіта каштоўнасці з’яўляюцца галоўнай пабуджальнай і рухаючай сілай грамадства. Любое грамадства характарызуецца уласцівай яму сістэмай каштоўнасцяў Яна з'яўляецца асноўным рэгулятарам чалавечай дзейнасці, ад яе залежаць думка, творчасць і вераванні індывідаў кожнага грамадства. П. Сарокін лічыць, што, даследуючы культурныя якасці (значэнні, нормы, каштоўнасці), схаваныя ў свядомасці індывідаў і выяўляючы ў іх дзейнасці (у культурных узорах), можна выявіць працяглыя перыяды чалавечай гісторыі, якія абапіраюцца на адны і тыя ж каштоўнасці, г.зн. розныя культуры. Кожная з гэтых культур непаўторная, яна нараджаецца, дасягае росквіту і затым памірае. На змену ёй прыходзіць іншая культура, якая абапіраецца на новую сістэму каштоўнасцяў і якая стварае свой, асаблівы свет чалавечага існавання.

Усякая вялікая культура ёсць не проста кангламерат розных суіснуючых з’яваў, якія аднак ніякім чынам не звязаны адна з адной, а ёсць адзінаства або індывідуальнасць, усе складнікі якога прасякнуты адным вызначальным прынцыпам і выражаюць адну галоўную каштоўнасць.

Дамінуючыя рысы мастацтваў і навукі такой адзінай культуры, яе філасофія і рэлігія, этыка і права, яе асноўныя формы сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай арганізацыі, пераважная частка яе нораваў і звычаяў, яе лад жыцця і мыслення (менталітэт) – усе яны па-свойму выражаюць яе вызначальны прынцып, яе галоўную каштоўнасць [4, с 424].

Класіфікацыя каштоўнайцей паводле П. Сарокіна прадстаўлена чатырма групамі. Першая ўключае каштоўнасці, якія ўзнікаюць у выніку пазнавальнай дзейнасці (асноўная сярод іх – праўда). Другая ахоплівае каштоўнасці эстэтычнага задавальнення (цэнтральная – прыгажосць). Трэцяя тычыцца каштоўнасцяў сацыяльнай адаптацыі і маралі (дамінанта – дабро). Чацвёртая група прадугледжвае наяўнасць каштоўнасцяў, якія аб'ядноўваюць усё ў адзінае цэлае (карысць) 385 – 386 . Атрымліваецца, што культура – гэта сістэма каштоўнасцяў, з дапамогай якіх грамадства інтэгруецца, падтрымлівае функцыянаванне і ўзаемасувязь сваіх інстытутаў.

Такім чынам, культура выступае як сукупнасць дасягнутых у працэсе асваення свету матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Усё вышэйакрэсленае дыктуе неабходнасць паглядзець на айчынную гісторыю і культуру з пазіцыі духоўна-маральнага пачатку, яе каштоўнаснага зместу і напаўнення.

Літаратура:

1. Бердяев, М. Царство духа и царство кесаря / М. Бердяев. – М.: АСТ, 2006.
2. Зборовский, Г. Е. История социологии / Г. Е. Зборовский. – М.: Гардарики, 2004.
3. Риккерт, Г. Философия истории // Риккерт Г. Науки о природе и науки о культуре. – М.: Республика, 1998.
4. Сорокин, П. Человек. Цивилизация. Общество / П. Сорокин. – М: Политиздат, 1992.

## ДУХОВНО-НРАВСТВЕННЫЕ АСПЕКТЫ ФОРМИРОВАНИЯ СОЦИОКУЛЬТУРНОЙ БЕЗОПАСНОСТИ БУДУЩИХ УЧИТЕЛЕЙ

С.В. Иглидан, г. Одесса, Украина

Социокультурная безопасность – неотъемлемая часть профессиональной культуры педагога. Наряду с духовно-нравственными и социально-правовыми аспектами, социокультурная безопасность на рубеже XX — XXI веков привлекает внимание ученых, различных научных отраслей (педагогика, философия, социология и психология), как близкого, так и дальнего зарубежья.

Сущность глобализационных процессов, связанных с безопасностью, невозможно понять во всей полноте, не учитывая всех тех изменений, которые произошли в области культуры. Влияние данных